ПРАВААБАРОНЦЫ
ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

# Выбары*2025. Аналітычная справаздача аб утварэнні ўчастковых камісій

*Экспертная місія па назіранні за выбарамі*2025*[1] *арганізаваная Беларускім Хельсінкскім Камітэтам і ПЦ "Вясна" ў межах кампаніі "Праваабаронцы за свабодныя выбары". Місія збірае і аналізуе інфармацыю аб выбарчай кампаніі паводле адкрытых крыніц і паведамленняў ад выбаршчыкаў з Беларусі.*

## ВЫСНОВЫ

1. Фармаванне ўчастковых выбарчых камісій (УВК), што непасрэдна арганізуюць і праводзяць галасаванне і падлік галасоў, завершанае ў адпаведнасці з каляндарным планам 26 снежня 2024 г.

2. Агулам было ўтворана 5325 УВК (на 86 менш, чым у адзіны дзень галасавання 2024 г., і на 398 менш, чым на прэзідэнцкіх выбарах 2020 г. (даныя без уліку ўчасткаў за мяжой у 2020 г.)). У іх склад увайшло 56 550 чалавек. Скарачэнне колькасці УВК пры невялікім павелічэнні сярэдняй колькасці сябраў[2] камісій азначае, што скарочаныя малалікія ўчасткі, то-бок гэты працэс можна ахарактарызаваць як узбуйненне выбарчых участкаў; такая аптымізацыя адлюстроўвае дэмаграфічныя працэсы, але можа ставіць пытанне фізічнай даступнасці ўчасткаў;

3. Захоўваецца тыповая для беларускай мадэлі імітацыі дэмакратычных працэсаў карціна асноўных суб'ектаў, якія вылучалі сваіх прадстаўнікоў у склад УВК ("іншыя грамадскія аб'яднанні", палітычныя партыі, грамадзяне, працоўныя калектывы). У сітуацыі татальнай зачысткі грамадзянскай актыўнасці асабліва сумнеўнай з'яўляецца заяўленая нізавая

[1] "Выбары*" у дачыненні да выбарчай кампаніі-2025 выкарыстоўваецца кампаніяй "Праваабаронцы за свабодныя выбары" з зорачкай, каб падкрэсліць умоўны характар гэтага тэрміна, паколькі любая свабодная і справядлівая выбарчая кампанія прадугледжвае, перш за ўсё, умовы, калі напоўніцу рэалізуюцца правы і свабоды, уключна з свабодай слова, свабодай мірных сходаў і асацыяцый, правам удзельнічаць у кіраванні сваёй дзяржавай, свабодай ад дыскрымінацыі, што ў цяперашні час у Беларусі практычна адсутнічае

[2] "Сябра" ды іншыя назоўнікі марфалагічнага мужчынскага роду выкарыстоўваюцца ў значэнні агульнага роду і абазначаюць усе гендары

актыўнасць грамадзян, якія нібыта вылучылі больш за 16,5 тысяч прадстаўнікоў, што сабралі подпісы як мінімум 10 чалавек у падтрымку свайго вылучэння.

4. Ненатуральна выглядаюць паводзіны палітычных партый (пасля перарэгістрацыі 2023 г. іх засталося ўсяго 4): лідары 3 з гэтых партый зарэгістраваныя ў якасці кандыдатаў у прэзідэнты, і было б лагічна бачыць актыўную гатоўнасць запоўніць УВК сваімі прадстаўнікамі, але гэтыя 3 партыі сукупна вылучылі толькі 4,3% ад агульнай колькасці вылучаных прадстаўнікоў. Такія паказчыкі падкрэсліваюць імітацыйны характар удзелу палітычных партый ды іх лідараў у гэтых выбарах*; іх асноўная роля — забеспячэнне легітымацыі працэдуры праз стварэнне карцінкі альтэрнатыўнасці і дэмакратычнасці;

5. У выніку непразрыстага працэсу разгляду органамі выканаўчай вертыкалі спісаў вылучаных прадстаўнікоў, яны практычна цалкам былі зацверджаныя (99,5% ад вылучаных у сябры УВК). Прадстаўнікі грамадзян занялі 29,1% месцаў ва УВК; прадстаўнікі 4 палітычных партый — 9,8%; прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў (большасць з якіх — найбуйнейшыя праўладныя арганізацыі, што маюць з 2023 г. заканадаўча замацаваны асаблівы статус набліжанасці да дзяржавы) — 49,4%; прадстаўнікі працоўных калектываў — 11,7%;

6. Прыкметная асаблівая роля праўладных прафсаюзаў, якія атрымалі 15,7% месцаў ва УВК, што пацвярджае ролю прафсаюзаў як адной з асноўных крыніц "працоўных рук" для парушэння выбарчага заканадаўства і пры гэтым стварэння карцінкі дэмакратычнага працэсу.

7. Гэтак жа як у выпадку з тэрытарыяльнымі і акруговымі камісіямі, захоўваецца гендарная дыспрапорцыя: доля жанчын (74,8%) у складзе УВК значна перавышае долю мужчын.

8. Трэцюю выбарчую кампанію заканадаўства дазваляе не публікаваць пайменныя спісы сябраў УВК. Гэта значна ўскладняе магчымасць ацаніць спецыфіку складу УВК, у прыватнасці тое, наколькі захоўваецца "вытворчы прынцып", што звычайна практыкуецца ў час фармавання выбарчых камісій, калі сябры камісіі лічацца прадстаўнікамі розных суб'ектаў (партыі, грамадзяне, грамадскія аб'яднанні), але набраныя

з аднаго працоўнага калектыву, а іх непасрэдныя начальнікі з'яўляюцца кіраўнікамі гэтых выбарчых камісій;

9. Фармаванне УВК (як і іншыя этапы выбараў*2025) праходзіла без незалежнага назірання, таму працэдурныя аспекты фармавання УВК застаюцца без грамадскага кантролю.

10. Этап фармавання УВК практычна не быў прыкметны ў публічнай прасторы: не было шырокага інфармавання выбаршчыкаў аб правах і магчымасцях па ўдзелу ў фармаванні УВК, што паказвае агульную незацікаўленасць уладаў у рэальным удзеле грамадзян у выбарчым працэсе і пацвярджае курс на абсалютны адміністрацыйны кантроль над усімі этапамі выбараў*2025.

## I. ПРАВАВАЯ БАЗА

Участковая выбарчая камісія – гэта орган, які арганізуе выбары на канкрэтным выбарчым участку: рэгістрацыю выбаршчыкаў, правядзенне галасавання і падлік галасоў.

У параўнанні з папярэднімі прэзідэнцкімі выбарамі заканадаўчае рэгуляванне працэсу фармавання УВК зведала шэраг змяненняў, у тым ліку:

- выключаныя згадкі пра ўтварэнне ўчастковых камісій за межамі Рэспублікі Беларусь;
- выключана палажэнне аб публікацыі рашэння аб утварэнні камісій (у якім, у прыватнасці, утрымліваецца пайменны спіс сябраў камісіі).

УВК ствараецца на час канкрэтнай выбарчай кампаніі і працуе ў межах паўнамоцтваў, вызначаных артыкулам 44 Выбарчага кодэкса (ВК). Парадак утварэння УВК ды іх склад вызначаецца артыкуламі 34-35 ВК: залішне складаны і перагружаны тэкст гэтых нормаў абцяжарвае іх успрыманне і практычнае ўжыванне. Таму звычайна ЦВК для чарговай электаральнай кампаніі выпускае адпаведныя тлумачэнні. Тлумачэнне парадку ўтварэння УВК у межах выбараў* 2025 дадзена ў пастанове ЦВК ад 24 кастрычніка 2024 г. №69 "Аб растлумачэнні парадку ўтварэння камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь",[3] якое шмат у чым

[3] https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post69-2025.pdf

дублюе палажэнні такіх жа "тлумачальных" пастаноў ЦВК на папярэдніх выбарчых кампаніях.

**Тэрмін фармавання.** УВК павінны быць сфармаваныя не пазней, чым за 30 дзён да пачатку выбараў.[4] У дачыненні да выбараў* 2025 – не пазней за 26 снежня 2024 г.

**Права вылучэння прадстаўнікоў ва УВК.** Прадстаўнікоў у склад УВК маюць права вылучаць:[5]

- палітычныя партыі ды іншыя грамадскія аб'яднанні,
- працоўныя калектывы ў колькасці не менш за 10 чалавек,
- грамадзяне, якія валодаюць выбарчым правам, у колькасці не менш за 10 чалавек.

**Парадак вылучэння прадстаўнікоў ва УВК.** Для кожнага з суб'ектаў, упаўнаважаных вылучаць сваіх прадстаўнікоў у склад УВК, прадугледжаны свой парадак прыняцця рашэння аб вылучэнні кандыдатаў і неабходны пакет дакументаў. Для вылучэння сваіх прадстаўнікоў ва УВК неабходна падаць пратакол сходу, пасяджэння або падпісаную групай грамадзян заяву.[6]

**Фармаванне складу УВК.** Фармаванне (утварэнне) УВК, г. зн. прыняцце рашэння, хто з вылучаных прадстаўнікоў увойдзе ў склад УВК, ускладзенае на падсправаздачную прэзідэнту выканаўчую вертыкаль: раённыя ці гарадскія выканаўчыя камітэты, а ў гарадах з раённым дзяленнем – мясцовыя адміністрацыі.

Рашэнне аб фармаванні УВК прымаецца на пасяджэнні мясцовых выканаўчых органаў, на якім маюць права прысутнічаць прадстаўнікі суб'ектаў, што вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад УВК.[7] Магчымасць прысутнасці назіральнікаў на такіх пасяджэннях не прадугледжаная.

У выбарчым заканадаўстве Беларусі адсутнічаюць якія-небудзь крытэрыі адбору і сістэма ацэнкі кандыдатур. У сваіх тлумачэннях ЦВК ад аднаго выбарчага цыклу да іншага паўтарае[8] ўстаноўку агульнага характару: "перад прыняццем рашэння аб утварэнні камісіі [...] на

[4] ВК, частка 1 арт. 34
[5] ВК, частка 2 арт. 35
[6] ВК, частка 6 арт. 35
[7] ВК, арт. 34
[8] Напрыклад, для выбараў* 2024 - Пастанова ЦВК ад 21.11.2023 № 30, пункт 12: https://rec.gov.by/uploads/files/Calendar/post30-2023.pdf
для прэзідэнцкіх выбараў 2020 - пастанова ЦВК ад 08.05.2020 № 13, пункт 9: https://rec.gov.by/files/2020/post13.pdf

абмеркаванне выносіцца пытанне аб дзелавых і асабістых якасцях асоб, вылучаных у склад камісіі".[9] Мяркуючы па фармулёўцы рэкамендацый, персанальнае галасаванне па кожнай кандыдатуры праводзіцца толькі ў выпадку, калі колькасць прэтэндэнтаў перавышае прадугледжаную колькасць сябраў УВК.[10]

Рашэнне аб фармаванні УВК. У рашэнні аб утварэнні камісій паказваюцца: прозвішча, імя, імя па бацьку (калі такое маецца) кожнага сябра камісіі, спосаб вылучэння ў склад камісіі, месца знаходжання і нумары тэлефонаў камісіі. Рашэнне не публікуецца.[11] Замест гэтага, у перыядычных друкаваных выданнях публікуецца паведамленне аб утварэнні камісій (якое не ўтрымлівае спіс сябраў камісіі) у сямідзённы тэрмін пасля прыняцця адпаведнага рашэння.

**Патрабаванні да складу УВК.** Згодна з часткай 1 артыкула 34 ВК камісіі мусяць быць сфармаваныя ў складзе ад 5 да 19 чалавек.

У Выбарчым кодэксе робіцца спроба вызначыць цэнзы на палітычнае прадстаўніцтва: рэкамендуецца фармаваць не менш за адну трацiну складу УВК (за выключэннем УВК у вайсковых частках і месцах часовага знаходжання выбаршчыкаў) з прадстаўнікоў палітычных партый ды іншых грамадскіх аб'яднанняў.[12] Пры гэтым, адсутнічаюць гарантыі забеспячэння роўнасці ўдзельнікаў выбарчай кампаніі за выключэннем абмежавання на колькасць прадстаўнікоў ад адной арганізацыі (не больш за адзін).

Абмежаванні абавязковага характару вызначаныя для дзяржаўных служачых: доля дзяржаўных служачых у складзе асобнай УВК не можа складаць больш за адну трацiну. Таксама вызначаныя катэгорыі дзяржаўных служачых, якія не могуць уваходзіць у склад УВК: суддзі, пракуроры, кіраўнікі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў.

**Абскарджанне.** Згодна з вызначаным парадкам абскарджання,[13] правам на падачу скаргі надзеленыя суб'екты, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісій. Скарга падаецца ў суд паводле тэрытарыяльнай прыналежнасці выканаўчага органа, што вынес рашэнне, якое абскарджваецца. Тэрмін абскарджання – 3 дні з дня прыняцця рашэння.

[9] Пастанова ЦВК ад 24.10.2024 №69, пункт 9.
[10] Тамсама.
[11] ВК, частка 6 арт. 34
[12] ВК, частка 2 арт. 34
[13] ВК, частка 7 арт. 34

## II. ПРАЦЭС ВЫЛУЧЭННЯ ПРАДСТАЎНІКОЎ У СКЛАД УВК

Вылучэнне прадстаўнікоў у склад УВК адбылося ў адпаведнасці з каляндарным планам:[14] не пазней за 20 снежня 2024 г.

Назіраецца тэндэнцыя скарачэння колькасці УВК (нават з улікам адмовы ад выбарчых участкаў за мяжой). Так, на выбарах*2025 сфармавана 5325 участковых камісій, гэта значыць на 86 адзінак менш, чым на парламенцкіх і мясцовых выбарах*2024[15] (5411 УВК) і на 398 адзінак менш, чым у прэзідэнцкую кампанію 2020 года (5723[16] УВК без уліку ўчасткаў за мяжой). Скарачэнне колькасці УВК можа быць звязана са скарачэннем насельніцтва Беларусі[17] ды паказваць на змяншэнне колькасці выбаршчыкаў, што, у сваю чаргу, часткова можа быць абумоўлена такімі фактарамі як вымушаная эміграцыя.[18]

Паводле афіцыйных даных, стаць сябрамі выбарчых камісій вырашылі 56840 чалавек. Чатыры праўладныя[19] палітычныя партыі, што засталіся пасля перарэгістрацыі 2023 г., лідэры трох з якіх фармальна зарэгістраваныя ў якасці кандыдатаў, то-бок яны ў рэальным палітычным працэсе мусілі  быць зацікаўленыя ў актыўным удзеле сваіх прадстаўнікоў у працы УВК, вылучылі толькі 5548 (9,8%) прадстаўнікоў. Грамадскія аб'яднанні (у асноўным найбуйнейшыя праўладныя грамадскія аб'яднанні, якія маюць з 2023 года заканадаўча замацаваны асаблівы статус набліжанасці да дзяржавы[20]) вылучылі найбольшую колькасць прадстаўнікоў у склад УВК: 27949 (49,2%), адпаведна, грамадзяне – 16677 (29,3%), працоўныя калектывы – 6666 (11,7%).

---

[14] ЦВК, Каляндарны план, ст. 2: https://www.rec.gov.by/uploads/files/Calendar/kalendar2025.pdf

[15] Праваабаронцы за свабодныя выбары, Выбары*2024. Аналітычная справаздача аб утварэнні ўчастковых камісій / Праваабаронцы за свабодныя выбары 2024: https://elections2024.spring96.org/be/news/114160

"Агулам утворана 5 411 УВК (на 374 менш, чым на мінулых парламенцкіх выбарах і на 459 менш, чым на мінулых мясцовых выбарах). У іх склад увайшло 57 233 чалавекі".

[16] Праваабаронцы за свабодныя выбары, аналітычная справаздача аб назіранні за фармаваннем участковых выбарчых камісій, ст. 4: https://elections2020.spring96.org/be/news/97866

[17] Ср.: На 1 января 2021 г. -   9 349 645: https://www.belstat.gov.by/upload-belstat/upload-belstat-pdf/oficial_statistika/2024/naselenie_2024.pdf; на 1 января 2024 г.  - 9 155 978: https://www.belstat.gov.by/upload/iblock/f89/f89f2ee43f87b7d7f5392e680da5e529.pdf

[18] ООН, *Страх и репрессии: с мая 2020 года из Беларуси уехали 100 тысяч человек*, 22.03.2023: https://news.un.org/ru/story/2023/03/1439007

[19] Вясна, *Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Верасень 2023*, 03.10.2023: https://spring96.org/be/news/112957

"[...] у Беларусі не засталося зарэгістраваных апазіцыйных партый, а з 15 партый у Беларусі, якія існавалі на пачатак 2023 года, засталіся тры.."

[20] У адпаведнасці з законам "Аб асновах грамадзянскай супольнасці" яны аднесены рашэннем Міністэрства юстыцыі да суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, "якія маюць права на ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) у асаблівых формах", г. зн. іх залежнасць ад дзяржавы замацаваная заканадаўча:  https://minjust.gov.by/directions/compare_coverage/

# Праходнасць кандыдатаў




Працэс вылучэння ў склад УВК быў малапрыкметны. У публічнай прасторы не была заўважнай праца па папулярызацыі важнасці выбарчых камісій і не гучалі заклікі ўваходзіць у іх склад. На сайтах мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў была размешчана інфармацыя толькі пра час і месца прыёму дакументаў аб вылучэнні ў сябры ўчастковых выбарчых камісій. Пры такім фактычным замоўчванні этапу фармавання УВК выклікае абгрунтаваныя сумневы наяўнасць нізавой ініцыятывы, якая дазволіла аб'яднацца грамадзянам, каб вылучыць больш за 16,5 тысяч сваіх прадстаўнікоў, асабліва ў параўнанні з кампаніяй 2020 г., калі ад грамадзян было вылучана 35 355 чалавек і была актыўная кампанія прыцягнення грамадзян да працы ў камісіях, у прыватнасці, кампанія "Честные люди" вылучыла не менш за 2042 прадстаўнікоў у 1164 участковыя камісіі (пасля гэтыя даныя выраслі).[21]

Адсутнасць актыўнага інфармавання аб этапе вылучэння прадстаўнікоў ва УВК можа сведчыць аб незацікаўленасці дзяржавы ў допуску ў выбарчыя камісіі не ўзгодненых "зверху" кандыдатур, якія, у тым ліку, не прайшлі праверку на лаяльнасць, г. зн. гатоўнасць здзяйсняць парушэнні выбарчага заканадаўства або маўчаць пра іх. Актыўнасці па

[21] Выніковая аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2020 года / Праваабаронцы за свабодныя выбары 2020 https://elections2020.spring96.org/be/news/98939

вылучэнні прадстаўнікоў ва УВК не спрыяла агульная атмасфера запалохвання і страх быць рэпрэсаванымі[22] за выказванне гатоўнасці лічыць галасы сумленна.

## III. ПАСЯДЖЭННІ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ ЎТВАРАЮЦЬ КАМІСІІ

Мяркуючы з інфармацыі, размешчанай на сайтах выканаўчых камітэтаў і мясцовых адміністрацый, пасяджэнні органаў, якія фармуюць УВК, адбыліся ў вызначаны тэрмін — не пазней за 26 снежня 2024 г.

Гэты этап фармавання ўчастковых камісій прайшоў ва ўласцівай усёй кампаніі атмасферы непразрыстасці ды недастатковым інфармаванні грамадзян аб магчымасці ўдзелу ў ім. Па-ранейшаму адсутнічалі эфектыўныя магчымасці назірання за ходам прыняцця рашэнняў на пасяджэннях органаў, якія фармуюць камісіі. Пастанова ЦВК № 69, што ўдакладняе парадак фармавання камісій, прадугледжвае магчымасць прысутнасці на пасяджэннях толькі для прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, працоўных калектываў і грамадзян, якія вылучылі сваіх прадстаўнікоў у склад камісіі.[23] Магчымасць трансляцыі пасяджэнняў не прадугледжаная. Пры гэтым інфармаванне аб маючых адбыцца пасяджэннях заставалася выключна фармальным, (лаканічныя паведамленні на сайтах адпаведных органаў ва ўкладках, прысвечаных выбарам*, яны не высвечваліся ў стужцы важных навін пра жыццё пэўнага рэгіёну; часцяком не згадвалася права грамадзян прысутнічаць на пасяджэнні ў выпадку, калі яны вылучалі сваіх прадстаўнікоў ва УВК[24]), а ў асобных выпадках – адсутнічала зусім.[25]

Кароткія паведамленні аб мінулых пасяджэннях, размешчаныя на сайтах выканкамаў і мясцовых адміністрацый, таксама не ўтрымліваюць інфармацыі аб тым, як прымаліся рашэнні; дакладныя крытэрыі адсутнічаюць і ў заканадаўстве: пастанова ЦВК №69 згадвае толькі

---

[22] Вясна, *Мінімум 3 645 чалавек асудзілі паводле крымінальных справаў: тры гады пасля выбараў 2020*, 09.08.2023: https://spring96.org/be/news/112430

Вясна, *За 2024 год асудзілі не менш за 1 721 чалавека: вынікі крымінальнага пераследу*, 30.12.2024: https://spring96.org/be/news/117055

[23] Пастанова ЦВК ад 24.10.2024 № 69, пункт 8

[24] Сярод іншага, гл. прыклады лаканічнага інфармавання на сайтах Гродзенскага раённага выканаўчага камітэта (https://vitebsk.vitebsk-region.gov.by/ru/vybory-prezidenta-respubliki-belarus), Брэсцкага раённага выканаўчага камітэта(https://www.brest.brest-region.gov.by/ru/v4-ru/view/o-provedenii-ocherednogo-zasedanija-brestskoj-rajonnoj-komissii-po-vyboram-prezidenta-respubliki-belarus-2000005263), Гомельскага раённага выканаўчага камітэта (https://gomelisp.gov.by/obrazovanie-i-deyatelnost-uchastkovyh-komissij/).

[25] Сярод іншага, гл. інфармаванне на сайце Віцебскага раённага выканаўчага камітэта: https://vitebsk.vitebsk-region.gov.by/ru/vybory-prezidenta-respubliki-belarus

"дзелавыя і асабістыя якасці асоб, вылучаных у склад камісіі" ў якасці інфармацыі, на падставе якой прымаюцца рашэнні аб сяброўстве ва УВК.

## IV. СКЛАД УВК

27 снежня 2024 г., на наступны дзень пасля крайняга тэрміну фармавання камісій (не пазней за 26 снежня) ЦВК апублікавала вынікі фармавання УВК. Агулам было створана 5325 участкаў для галасавання і, адпаведна, столькі ж участковых камісій. У іх склад увайшло 56550 чалавек.

"Праходнасць" кандыдатаў у сябры УВК раўняецца ў сярэднім 99,5%, што выключае рэальна выбарны і спаборніцкі характар працэсу фармавання УВК і пацвярджае адміністрацыйна-камандны характар прызначэння ва УВК лаяльных і праверанных сістэмай людзей. Для параўнання, у 2020 г. ад грамадзян ва УВК было вылучана 35355 кандыдатаў, а ўвайшло 20800, г. зн. толькі 58,83%.[26]

| **Спосаб вылучэння** | **Вылучана** | **Увайшло** | **% праходнасці** |
|---|---|---|---|
| Падача заяў грамадзянамі | 16677 | 16455 | 98.6 % |
| Працоўныя калектывы | 6666 | 6642 | 99.6 % |
| Палітычныя партыі | 5548 | 5544 | 99.9% |
| Іншыя грамадскія аб'яднанні | 27949 | 27909 | 99.8% |
| Агулам | 56840 | 56550 | 99.5% |

Відавочная тэндэнцыя скарачэння колькасці сябраў камісій (што звязана са скарачэннем колькасці саміх участкаў): у 2024 годзе, пры правядзенні выбараў* у ніжнюю палату парламента і мясцовыя саветы дэпутатаў, ЦВК ужо значна скараціла колькасць участкаў для галасаванняў і пакінула яшчэ меншую колькасць на бягучыя выбары.[27] Тым не менш разлік сярэдняй па краіне колькасці сябраў УВК паказвае некаторае павелічэнне, дакладней, вяртанне да дакавідных практык 2019 – 2020 гадоў. Такім чынам, адбываецца ўзбуйненне выбарчых участкаў: можна

[26] Выніковая аналітычная справаздача па выніках назірання за выбарамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2020 года / Праваабаронцы за свабодныя выбары 2020 https://elections2020.spring96.org/be/news/98939
[27] Праваабаронцы за свабодныя выбары, Выбары*2024. Аналітычная справаздача аб утварэнні ўчастковых камісій: https://elections2024.spring96.org/be/news/114160

меркаваць, што скарочаныя ў першую чаргу малалікія ўчасткі. Узбуйненне выбарчых участкаў можа быць звязана з чаканнем нізкай яўкі выбаршчыкаў на фоне скарачэння насельніцтва і агульнай апатыі да палітычных працэсаў, што адначасова дазваляе ўладам і аптымізаваць выдаткі на арганізацыю выбараў. Скарачэнне малалікіх участкаў можа ставіць пытанне аб фізічнай даступнасці выбарчых працэдур.

## Колькасная дынаміка складу і колькасці УВК (2019–2025)




У выніку прадстаўнікі палітычных партый, якія мусілі быць асноўнымі гульцамі ў выбарчым працэсе, склалі 9,8% сябраў камісій. З улікам рэгістрацыі ў якасці кандыдатаў у прэзідэнты лідараў 3 з пакінутых у легальным статусе 4 палітычных партый, гэты паказчык лепш за іншыя ілюструе залежнае становішча і дэкаратыўны характар як саміх партый, так і іх кандыдатаў — спарынг-партнёраў для А. Лукашэнкі. Абсалютная большасць сябраў УВК, 49,4% ад усяго складу — прадстаўнікі "іншых грамадскіх аб'яднанняў". Як і раней, сярод прадстаўленых — "Белая русь", "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", "Беларускі саюз жанчын", "Беларускі фонд міру", "Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў" і прафсаюзы, што ўваходзяць у Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі. Усе гэтыя пяць грамадскіх аб'яднанняў (акрамя Фонду міру) не проста GONGO, але ў адпаведнасці з законам "Аб асновах грамадзянскай супольнасці" аднесеныя

рашэннем Міністэрства юстыцыі[28] да суб'ектаў грамадзянскай супольнасці, "якія маюць права на ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі (арганізацыямі) у асаблівых формах", то-бок іх залежнасць ад дзяржавы замацаваная заканадаўча. З усіх гэтых арганізацый самая вялікая доля прыпадае на праўладныя прафсаюзы (15,8%), што пацвярджае ролю прафсаюзаў як асноўных "працоўных рук" парушэння выбарчага заканадаўства пры стварэнні карцінкі дэмакратычнага працэсу. Незалежных арганізацый грамадзянскай супольнасці, якія займаюцца палітычнымі пытаннямі, у Беларусі сёння не засталося: многія арганізацыі прымусова ліквідуюцца, а іх сябры пераследуюцца паводле выключна палітычных нагодаў.[29]

Амаль траціна сябраў УВК, якія нібыта прадстаўляюць грамадзян, ва ўмовах, дзе фармаванне камісіі ажыццяўляецца зверху з лаяльных і правераных кандыдатаў, сведчаць пра спробу ўладаў імітаваць дэмакратычныя працэдуры, каб легітымізаваць бягучыя выбары*.

Адначасова з гэтым, улічваючы адміністрацыйна-камандны падыход да арганізацыі выбараў*,[30] працоўныя калектывы бюджэтных арганізацый знаходзяцца пад моцным уплывам кіраўніцтва, якое дзейнічае ў інтарэсах уладаў. Фармальна гэта дазваляе паказаць удзел "грамадскасці", але ў рэальнасці такія сябры УВК часцей за ўсё прадстаўляюць не незалежную волю работнікаў, а дырэктыву зверху. Уключэнне ў склад УВК 11,7% сябраў ад працоўных калектываў у чарговы раз сведчыць аб выкарыстанні іх як інструмента дзяржаўнай мабілізацыі, дзе ўключэнне лаяльных супрацоўнікаў у выбарчыя структуры гарантуе выкананне зададзеных сцэнароў выбараў.

Такім чынам, участковыя камісіі, страціўшы прыкметы дэмакратычнага інстытута, ператварыліся ў выканаўцу функцыі дэманстрацыі правядзення выбараў і тым самым – легітымізацыі ўлады.

---

[28] Міністэрства юстыцыі, палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні ды іншыя некамерцыйныя арганізацыі: https://minjust.gov.by/directions/compare_coverage/

[29] Lawtrend, НКО в Беларуси: ситуация с регистрацией и ликвидацией: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/nko-v-belarusi-situatsiya-s-registratsiej-i-likvidatsiej
Вынікі колькаснага даследавання па стане на 15 лістапада 2024 года: з пачатку 2021 года па 15 лістапада 2024 года прымусова ліквідавана не менш за 1180 некамерцыйных арганізацый розных арганізацыйна-прававых формаў. Найбольшая колькасць сярод прымусова ліквідаваных НДА складаюць грамадскія аб'яднанні – 889 арганізацый. Прымусова ліквідавана таксама не менш за 11 палітычных партый, 8 асацыяцый і 4 прафесійных саюзаў.

[30] Паводле высноў папярэдняй справаздачы, дазвол збору подпісаў на тэрыторыях прадпрыемстваў узмацніў механізм адміністрацыйнага прымусу ў падтрымку А. Лукашэнкі, прыбраў роўныя ўмовы для кандыдатаў ды засяродзіў адміністрацыйны рэсурс на дэманстрацыі падтрымкі аднаго кандыдата: https://elections2025.spring96.org/be/news/117054

У сувязі са створанай сітуацыяй, няма ніякіх вядомых фактаў аб абскарджанні рашэнняў аб фармаванні УВК, што звычайна мае месца ва ўмовах дэмакратычнай сістэмы. Ніхто з вылучаных, і пазней прызначаных, сябраў УВК не адчувае патрэбы ў аспрэчванні рашэнняў, бо ўвесь працэс носіць фармальны характар і цалкам дырыжуецца выканаўчай вертыкаллю.

## Склад участковых выбарчых камісій




Па-ранейшаму, застаецца высокай колькасць ва УВК жанчын (74,8%) у процівагу іх малой прадстаўленасці ў камісіях больш высокага ўзроўню (напрыклад, у ЦВК – 33%), што сведчыць аб дамінаванні класічных патрыярхальных установак, у якіх жанчыны пераважна прыцягваюцца да выканання бюракратычных функцый, у той час як кіраванне і прыняцце рашэнняў на вышэйшых узроўнях застаюцца пераважна мужчынскай прэрагатывай.

Адсутнасць пайменных спісаў сяброў УВК па-ранейшаму абцяжарвае ацэнку іх складу. Такая закрытасць робіць немагчымай праверку выканання прынцыпу незалежнасці і разнастайнасці ў фармаванні камісій, а таксама аналізу перавагі "вытворчага прынцыпу", пры якім сябры камісій фармальна нібыта прадстаўляюць розныя суб'екты (грамадзян, палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні), але набраныя з аднаго працоўнага калектыву, а іх непасрэдныя начальнікі займаюць кіруючыя пасады ва УВК.

У сувязі з гэтым, нельга выключаць, што склад камісій сёлета можа не моцна адрозніваецца ад мінулых гадоў, калі здзяйсняліся грубыя парушэнні выбарчага заканадаўства і міжнародных стандартаў правядзення сумленных і свабодных выбараў, што таксама пагаршае праблему непразрыстасці і ўмацоўвае існуючыя сувязі ўнутры сістэмы. Непразрыстасць складу УВК падрывае давер да выбарчага працэсу, перашкаджаючы грамадскаму кантролю, незалежнаму маніторынгу і падсправаздачнасці асноўнага звяна, адказнага за выкананне выбарчага заканадаўства на самых важных этапах выбарчага працэсу.